МІТЧЭЛ (Mitchell) Маргарэт (8.11.1900, г. Атланта, штат Джорджыя, ЗША — 16.8.1949), амерыканская пісьменіца; прадстаўнік т.зв. паўднёвай школы сучаснага амер. рамана. Па адукацыі журналіст. Аўтар гіст. рамана «Знесеныя ветрам» (1936, экранізацыя 1939) пра жыццё амер. Поўдня ў час грамадз. вайны 1861—65 і ў перыяд Рэканструкцыі. У рамане крытычна асэнсоўваецца «паўднёвы міф» пра вел1ч плантатарскага Поўдня, пра высакароднасць і вытанчанасць паўд. джэнтльменаў, пра еднасць белых і чорных. Пасмяротна апублікавана кн. «Лісты Маргарэт Мітчэл пра «Знесеныя ветрам», 1936— 1949» (1976).

Літ:. Рус. пер. — Унесенные ветром. Мн., 1991.

Літ:. Писатели США М., 1990.

Т.Я.Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ